9-га мая — Дзень Перамогі. Са святам, таварышы!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАУ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАУНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 16 (689) | Субота, 7 мая 1988 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




## ПОДЗВІГ НЕ ЗАБУДУЦЬ ПАКАЛЕННІ

Дзень Перамогі... Напэўна, няма больш радаснага і светлага свята для савецкіх людзей, чым гэта. Яно дарагое нам таму, што дасталося нязмернай цаной — цаной мільёнаў чалавечых жыццяў, якія былі аддадзены дзеля свабоды, незалежнасці нашага народа, народаў планеты.

У сорак трэці раз сустракаем мы, усё прагрэсіўнае чалавецтва свята Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Суровым і цяжкім быў шлях да Перамогі. Амаль чатыры гады працягвалася процiборства савецкага народа і яго Узброеных Сіл з гітлераўскай ваеннай машынай. У жорсткіх выпрабаваннях вайны, самай разбуральнай у гісторыі чалавецтва, калі стаяла пытанне аб жыцці ці смерці, наш народ здолеў адстаяць свабоду і незалежнасць сацыялістычнай Радзімы. Натхняльнікам і арганізатарам вялікай Перамогі з'явілася Камуністычная партыя. Па яе заклiку «Усё для фронту! Усё для перамогі!» краіна згуртавалася ў адзіны ваенны лагер. У прыгранічных баях, пры гераічнай абароне Ленінграда, Адэсы, Севастопаля гітлераўскі план маланкавай вайны быў сарваны, а ў бітве пад Масквой канчаткова пахаваны. Сакрушальныя ўдары па ворагу пад Сталінградам, Курскам, на Дняпры прывялі да карэннага пералому ў Вялікай Айчыннай і ва ўсёй другой сусветнай вайне. Выгнаўшы фашысцкіх захопнікаў з тэрыторыі СССР, савецкая армія з гонарам выканала і вялікую вызваленчую місію.

Савецкі народ і яго Узброеныя Сілы ўнеслі рашаючы ўклад у перамогу над фашысцкай Германіяй і яе саюзнікамі. Разам з Савецкай Арміяй супраць гітлераўскіх захопнікаў змагаліся Войска Польскае і Чэхаславацкая Армія, на заключным этапе вайны — арміі Балгарыі і Румыніі, воінскія часці Венгрыі. Стойкасць і гераізм у барацьбе з фашызмам праявілі югаслаўскі народ і яго Народна-вызваленчая армія. Але галоўны цяжар вайны вынес на сабе просты савецкі салдат, вялікі працаўнік, мужны і горача адданы сваёй Айчыне.

У дні вайны з усёй сілай праявіўся масавы гераізм савецкіх людзей на фронце і ў тыле. Мы аддаём даніну глыбокай павагі мужнасці савецкіх воінаў, якія, не шкадуючы жыцця, змагаліся з фашызмам у імя міру і жыцця на зямлі. Мы нізка схіляем галаву перад памяццю мужных сыноў і дачок, якія аддалі сваё жыццё за справу сваёй Радзімы. За подзвігі на франтах Вялікай Айчыннай вайны звыш 7 мільёнаў савецкіх воінаў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Звання Героя Савецкага Саюза былі ўдастоены больш 11 600 чалавек. Поўнымі кавалерамі ордэна Славы сталі звыш 2 500 воінаў. Каля 200 тысяч партызан і падпольшчыкаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі, шмат іх удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Цяпер Камуністычная партыя, Савецкая дзяржава робяць усё магчымае, каб адстаяць мір, прадухіліць ядзерную катастрофу. Выхаваная на слаўных традыцыях, Савецкая Армія разам з братнімі арміямі дзяржаў-удзельніц Варшаўскага Дагавору, надзейна служыць справе захавання міру.

У гэтыя перадсвяточныя дні мы з асаблівым пачуццём адносімся да ветэранаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, якія працуюць сярод нас. Мы выказваем ім сваю вялікую ўдзячнасць і павагу ва ўсё тое, што зрабілі яны дзеля нашага сённяшняга шчаслівага мірнага жыцця.

У нашым калектыве нямала тых, хто набліжаў светлы дзень Перамогі, змагаючыся і на фронце, і ў тыле ворага. Баявыя раненні, час бяруць сваё: радзеюць рады ветэранаў. І мы абавязаны адносіцца да гэтых людзей з яшчэ большай уважлівасцю і цеплынёй. Трэба толькі вітаць той факт, што студэнты нашага універсітэта стварылі клуб «Міласэрнасць», члены якога акружылі сваімі клопатамі і ўвагай ветэранаў вайны і працы. А кожная сустрэча моладзі з былымі воінамі, партызанамі, падпольшчыкамі ў студэнцкіх аўдыторыях, іх расказы аб грозных і гераічных гадах Вялікай Айчыннай вайны становяцца сапраўднымі ўрокамі мужнасці і міру.

Горача віншуем вас, дарагія ветэраны, з днём Перамогі! Моцнага Вам здароўя, актыўнага даўгалецця яшчэ на многія гады!

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ.**

## ДАНІНА ПАМЯЦІ І ПАВАГІ

У гэтыя перадсвяточныя дні, напярэдадні 43-й гадавіны Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, у нашым універсітэце, як і па ўсёй краіне, праходзіць «Тыдзень дзеянняў за еўрапейскую бяспеку і супрацоўніцтва». У яго праграму ўвайшлі сустрэчы ўдзельнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія працуюць у ГДУ, са студэнтамі акадэмічных груп, на факультэтах. Былыя ўдзельнікі баёў за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы дзеляцца сваімі ўспамінамі пра тыя гераічныя і грозныя гады, заклікаюць моладзь свята берагчы мір, змагацца за яго. На брацкія магілы загінуўшых воінаў, народных мсціўцаў, якія знаходзяцца ў студэнцкім парку, ускладзены вянкі і кветкі. Вялікую работу па арганізацыі выставак літаратуры, прысвечанай бессмяротнаму подзвігу ў гады Вялікай Айчыннай вайны, правяла універсітэцкая бібліятэка. На ўсіх яе абанементах афармлены тэматычныя выстаўкі.

## КОСМАС — МІРНЫМ МЭТАМ

Ці можна лётаць у космас і пры гэтым не выкарыстоўваць рэактыўныя рухавікі? Не толькі можна, але неабходна! — сцвярджае гомельскі інжынер А. Э. Юніцкі. Развіваючы ідэі Канстанціна Эдуардавіча Цыялкоўскага, ён прапанаваў прынцыпова новы праект вываду розных аб'ектаў на арбіту штучнага спадарожніка Зямлі, які атрымаў назву «агульнапланетны транспартны сродак» (АТС).

Не год, не пяць і нават не дзесяць спатрэбілася аўтару для таго, каб яго першапачатковая ідэя, пераадолеўшы ўсемагчымыя бар'еры, ператварылася ў стройную, глыбока аргументаваную канцэпцыю асваення калязямной касмічнай прасторы ў недалёкай будучыні. Зараз рэальнасць гэтага праекта прызнае большасць тых, хто з ім добра знаёмы па шматлікіх і разнастайных публікацыях у газетах і часопісах за апошнія гады.

Вось чаму сабраліся ў Гомелі энтузіясты і аднадумцы А. Э. Юніцкага на першую навукова-тэхнічную канферэнцыю «Безракетная індустрыялізацыя космасу: праблемы, ідэі, праекты».

Больш за сто чалавек прыехалі ў Гомель з 24 гарадоў Савецкага Саюза. Сярод іх буйныя спецыялісты, якія працуюць у розных галінах навукі і тэхнікі, эксперты па пытаннях міжнародных адносін і ваенна-палітычнай праблематыкі, філосафы, эканамісты, сацыёлагі...

Бурнымі апладысментамі сустрэлі госці і гамяльчане, што прыйшлі ў Дом палітычнай асветы абкома партыі на пленарнае пасяджэнне, лётчыкаў-касманаўтаў СССР двойчы Героя Савецкага Саюза Юрыя Васільевіча Малышава і Героя Савецкага Саюза Ігара Пятровіча Волка, якія прынялі ўдзел у рабоце канферэнцыі.

— Зямля падобная з космасу на блакітны адуванчык, — сказаў Ю. В. Малышаў. — АТС дапаможа зберагчы яго, а значыць і нас ад пагібелі, дзякуючы вынасу індустрыі планеты за межы атмасферы.

Абодва касманаўты станоўча выказаліся аб праекце, падкрэсліўшы пры гэтым, што ён з'яўляецца рэальнай, мірнай альтэрнатывай мілітарызацыі касмічнай прасторы. Не менш важны АТС як танны і экалагічна чысты сродак дастаўкі грузаў і людзей на арбіту.

У ходзе канферэнцыі прагучала каля 30 дакладаў. Удзельнікі абмеркавалі звыш ста выступленняў, што былі зроблены ў час «круглых сталоў». Цэнтральнае месца ў іх тэматыцы занялі перспектывы асваення космасу і магчымасці касманаўтыкі ў вырашэнні глабальных праблем сучаснасці.

Канферэнцыя выклікала жывую цікавасць і ў многіх вучоных, супрацоўнікаў, студэнтаў нашага універсітэта. За дні знаходжання ў Гомелі яе ўдзельнікі наведалі навучальныя ўстановы горада, калектывы прадпрыемстваў і арганізацый, дзе вялася размова па пытаннях мірнага выкарыстання космасу, усеагульнай барацьбы за недапушчэнне яго мілітарызацыі.

Наш універсітэт наведаў лётчык-касманаўт СССР І. П. Волк. Ён меў гутарку ў рэктараце, цікавіўся пастаноўкай навуковых даследаванняў у ГДУ на этапе перабудовы вышэйшай школы.

З выкладчыкамі і студэнтамі фізічнага факультэта сустрэліся член федэрацыі касманаўтыкі СССР, начальнік канструктарскага бюро Тульскага зброевага завода М. І. Каравікоў і інжынер-даследчык Тульскага політэхнічнага інстытута А. В. Марозаў. Першы з іх выступіў з дакладам «Сістэмная фізіка», які вызначаецца пэўнай навізной у сучаснай навуцы.

У размове з карэспандэнтам нашай газеты М. І. Каравікоў адзначыў пахвальную актыўнасць студэнтаў фізічнага факультэта ў іх імкненні да абагачэння сваіх ведаў.

# ФОНД НАШЫХ СЭРЦАЎ

Сярод шматлікіх грамадскіх арганізацый, якія прымаюць актыўны ўдзел у барацьбе за мір, асаблівае месца займае Савецкі Фонд міру, створаны ў 1961 годзе. Савецкія людзі, занепакоеныя пагрозай новай сусветнай вайны, сталі дасылаць добраахвотныя ўзносы для фінансавання барацьбы за мір. З кожным годам іх колькасць павялічвалася і ўзнікла неабходнасць стварэння арганізацыі, якая не толькі займалася б зборам сродкаў, але і фінансавала ўвесь рух прыхільнікаў міру.

У нашай рэспубліцы з першага дня стварэння арганізацыі Фонду міру пачалася вялікая растлумачальная работа аб яго мэтах і задачах. Актывісты страсна выступалі на антываенных мітынгах, прымалі ўдзел у шэсцях і маніфестацыях. І гэта работа атрымала жывы водгук у жыхароў Беларусі. У цяперашні час, акрамя рэспубліканскага, існуюць аддзяленні Фонду міру ва ўсіх абласцях, гарадах і раёнах. А ў працоўных калектывах і навучальных установах, у тым ліку і ў ГДУ, актыўна дзейнічае звыш 14 тысяч камісій садзейнічання Савецкаму Фонду міру, у якія выбрана больш за 100 тысяч чалавек.

З дня заснавання старшынёй праўлення рэспубліканскага аддзялення Фонду міру з'яўляецца выдатны скульптар, народны мастак СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўных прэмій СССР, акадэмік Акадэміі мастацтваў СССР З. І. Азгур.

Матэрыяльная аснова Фонду міру — добраахвотныя ўзносы. Яны даволі разнастайныя. У многіх калектывах стала добрай традыцыяй у адзін з выхадных дзён праводзіць вахты міру і зароблены грошы пералічваць у гэты Фонд. Свой уклад уносяць у яго дзеячы культуры і мастацтва, работнікі навукі, студэнты і школьнікі, ветэраны вайны і працы.

Вынікам вахты міру з'яўляецца не толькі важкае папаўненне Фонду, але і разнастайная дадатковая прадукцыя, якая ідзе на патрэбы народнай гаспадаркі, на павышэнне дабрабыту савецкіх людзей, на ўмацаванне абароназдольнасці нашай дзяржавы.

Савецкі Фонд міру з'яўляецца і матэрыяльнай базай савецкага руху за мір. Фонд выдзяляе сродкі, неабходныя для дзейнасці 16 савецкіх грамадскіх арганізацый, якія ўдзельнічаюць у гэтым руху. Гэта — Савецкі камітэт абароны міру, Савецкі камітэт салідарнасці краін Азіі і Афрыкі, Савецкі камітэт ветэранаў вайны, Камітэт савецкіх жанчын, Савецкі камітэт за еўрапейскую бяспеку і супрацоўніцтва і інш. У 1986 годзе, напрыклад, Фонд міру прыняў удзел у далявым фінансаванні такіх важнейшых мерапрыемстваў Міжнароднага года міру, як Сусветны кангрэс міралюбівых сіл у Капенгагене і канферэнцыя 5 кантынентаў у Афінах. На сродкі Фонду міру праводзіліся і важнейшыя міжнародныя мерапрыемствы 1987 года — форум «За без'ядзерны свет, за выжыванне чалавецтва», VII кангрэс міжнароднага руху «Урачы свету за прадухіленне ядзернай вайны», Сусветны кангрэс жанчын.

Фонд аказвае фінансавую дапамогу і ў арганізацыі такіх мерапрыемстваў, як «Марш міру», «Караблі міру», «Паязды дружбы» і г. д., якія праводзяцца разам з зарубежнай грамадскасцю. Вялікі рэзананс выклікалі арганізаваныя Савецкім камітэтам абароны міру летам 1987 года круізы па Волзе і Дняпру прадстаўнікоў антываенных арганізацый з розных краін і савецка-амерыканскі «Паход за мір» па маршруту Ленінград — Масква. Такія акцыі міралюбівай грамадскасці, як адзначалася ў адказе М. С. Гарбачова на зварот удзельнікаў «Паход за мір», з'яўляюцца «прыкладам народнай дыпламатыі», яны «вядуць да ўстанаўлення добрасуседскіх адносін непасрэдна паміж простымі людзьмі розных краін».

Працоўныя Беларусі ўносяць ва ўсенародную барацьбу за мір свой важкі матэрыяльны ўклад. Толькі ў час «Тыдня дзеянняў супраць вайны, за бяспеку і супрацоўніцтва» адбылося 540 вахт і рэйсаў міру, а зароблены грошы ў суме звыш 1,5 млн. рублёў паступілі на рахунак Савецкага Фонду міру. А ўсяго ў год 70-годдзя Вялікага Кастрычніка на справу барацьбы за мір ад Беларусі паступіла звыш 16 млн. рублёў, што з'яўляецца самым высокім укладам за ўсю гісторыю Фонду міру. Беларускія пісьменнікі В. Вітка, Н. Гілевіч, Э. Агняцвет, В. Зуёнак, Э. Скобелеў, Я. Янішчыц, А. Вольскі, У. Карызна ўнеслі ў Фонд міру ганарары за творы. Часопісы «Беларусь», «Работніца і сялянка», «Вясёлка», «Бярозка», калектывы рэдакцый многіх газет, радыё і тэлебачання перадалі справе барацьбы за мір ганарары за цэлыя нумары і перадачы.

Буйныя ўзносы зрабілі многія беларускія вучоныя.

Калі мы гаворым аб тым, што рух прыхільнікаў міру стаў сапраўды ўсенародным, трэба зразумець, што ў агульным страі барацьбітоў за мір ідуць асобы, глыбока перакананыя ў неабходнасці самых актыўных дзеянняў супраць сіл вайны. Розныя бываюць прычыны, г. зн. кропкі адліку іх дзеянняў, розныя матывы, але мэта адна і яе можна сфармуліраваць коратка і вельмі проста: «Не — вайне!».

Гісторыя вучыць, што супраць вайны трэба змагацца, пакуль яна не пачалася. Таму барацьбіты за мір нашай рэспублікі нарошчваюць свае намаганні па развіццю антываеннага руху. Наша задача — не проста ўзмацніць барацьбу за мір, а ўзняць яе на якасна новы ўзровень. Гэта значыць, трэба дайсці да сэрца кожнага чалавека, выклікаць у яго патрэбу, неабходнасць унесці асабісты ўклад у барацьбу за мір. У перыяд, калі ў нашым універсітэце праводзіцца збор грашовых сродкаў у Савецкі Фонд міру, заклікаем усіх унесці свой уклад у гэтую высакародную справу.

Адна з важнейшых заслуг савецкіх барацьбітоў за мір, усяго антываеннага руху — злом стэрэатыпаў у народаў замежных краін, якія пачалі разумець, што мы не ворагі, а суседзі па планеце.

Сёння ўсе людзі зямлі знаходзяцца пад уражаннем паспяхова прайшоўшых савецка-амерыканскіх перагавораў у Вашынгтоне. Гэта, бясспрэчна, вялікая перамога ўсіх міралюбівых сіл, але нельга задавальняцца дасягнутым. Кансерватыўныя сілы ЗША згуртоўваюць свае рады, каб даць бой пры ратыфікацыі савецка-амерыканскага дагавору па РСД і РМД, выхаласціць яе сутнасць усемагчымымі дапаўненнямі і папраўкамі. Вось чаму барацьбітам за мір неабходна яшчэ больш узмацняць свае намаганні ў найвялікшай гістарычнай бітве за захаванне жыцця на нашай планеце.

Абавязак усіх лектараў таварыства «Веды» — нястомна, страсна прапагандаваць мудрую міралюбівую палітыку КПСС і Савецкага ўрада, расказваць аб магутным руху яе прыхільнікаў, аб дзейнасці Савецкага Фонду міру, «Фонду нашых сэрцаў».

**В. СТАРАКОЖАВА,**
**адказны сакратар універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды».**

Тамара ЛУКОВСКАЯ.

## Весна 45-го года

Весна, как весна, без особых примет
Всё так же играла природа,
И всё же другая и всё-таки нет
Весна сорок пятого года,
Руками народов убита война,
На землю вернулась свобода.
Её среди тысячи вёсен пойму,
За что ликовала природа,
И каждую веточку к сердцу прижму
За тех, кто не слышал победного года.
Как он прокатился по нашей земле
И с майской грозою гремели салюты,
Как радостно было тебе и ему
И горестно было кому-то...
И радости слёзы и слёзы печали
Слились той весной, как единый ручей,
За эту войну мы друзей потеряли,
За эту войну мы узнали друзей.
И всё-таки есть у весны той примета,
И всё-таки ярче и звонче она,
Её величают народы победой,
И мира началом ей быть до конца.

# АБ СКАРБАХ ТВОРЧАСЦІ

Гомельскае абласное аддзяленне Савецкага фонду культуры з моманту свайго ўтварэння распачало актыўную дзейнасць па прапагандзе лепшых дасягненняў нацыянальнай літаратуры і мастацтва, невычэрпных скарбаў вуснай народнай творчасці. Кіраўнікамі і актывістамі фонду плануюцца выезды і творчыя сустрэчы людзей мастацтва, пісьменнікаў, вучоных, самадзейных артыстаў з насельніцтвам горада і вобласці непасрэдна на прадпрыемствах, ва ўстановах, школах , калгасах і саўгасах.

Зусім нядаўна сведкамі і ўдзельнікамі такой сустрэчы сталі вучні і настаўнікі Пакалюбіцкай сярэдняй школы Гомельскага раёна, а таксама жыхары населенага пункта. У памяшканні калгаснага Палаца культуры тут адбыўся тэматычны вечар, прысвечаны перакладам твораў А. С. Пушкіна на беларускую мову народным паэтам Беларусі Аркадзем Куляшовым.

Арганізатары і ўдзельнікі вечара былі цёпла сустрэты гледачамі. Вечар адкрыў старшыня праўлення абласнога аддзялення Савецкага фонду культуры доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР, загадчык кафедры беларускай мовы нашага універсітэта У. В. Анічэнка. Ва ўступным слове, звернутым да ўдзельнікаў сустрэчы, ён адзначыў неперасягнутае значэнне творчай спадчыны вялікага рускага паэта і ўздзеянне яе на свядомасць і пачуцці многіх пакаленняў людзей.

Загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Гомельскага абласнога камітэта партыі кандыдат філалагічных навук М. М. Воінаў у сваім цікавым і змястоўным дакладзе прасачыў гісторыю і адзначыў асаблівасці ўплыву бессмяротнай ліры Пушкіна на беларускую літаратуру, пачынаючы з выдатнай ананімнай паэмы «Тарас на Парнасе» і заканчваючы творамі сучаснікаў. Затым ён больш падрабязна спыніўся на перакладах пушкінскіх твораў Аркадзем Куляшовым, цэнтральнае месца сярод якіх займае цудоўны і ўсім нам добра вядомы «Яўген Анегін».

Другую частку вечара склаў канцэрт самадзейных артыстаў. Ён адкрыўся мастацкай літаратурнай кампазіцыяй на вершы А. С. Пушкіна і А. Куляшова ў выкананні фальклорна-этнаграфічнага ансамбля студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта. Беларускія народныя песні натхнёна праспявала жаночая вакальная група студэнтаў. Былі прачытаны вершы П. Броўкі, М. Танка. Некалькі песень прагучала ў пранікнёным выкананні мясцовых самадзейных артыстаў.

На вечары ў знак шчырай падзякі арганізатарам сустрэчы і самадзейным артыстам гучалі апладысменты.

**В. ЯЦУХНА,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

*На кніжную паліцу*

# ГЕРОІ САВЕЦКАЙ РАДЗІМЫ

Ужо на працягу 20 гадоў у Палітвыдавецтве выходзіць серыя «Героі Савецкай Радзімы». Гэта мастацка-дакументальныя нарысы аб лепшых людзях нашай краіны — прафесіянальных рэвалюцыянерах, старых бальшавіках — саратніках У. І. Леніна, героях грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, героях працы — рабочых, калгасніках, вучоных. Гэта людзі розных пакаленняў, але яны беззапаветна адданы справе рэвалюцыі, справе партыі.

**М. В. МАСАЛОЎ. За асаблівыя заслугі:** Пра Героя Савецкага Саюза А. А. Бісеніек. — М.: Палітвыдат, 1988.

У гады Вялікай Айчыннай вайны на станцыі Дно — буйнейшым чыгуначным вузле, размешчаным недалёка ад Ленінграда, дзейнічала падпольная група савецкіх патрыётаў на чале з радавой чыгуначніцай Анастасіяй Бісеніек. Толькі праз некалькі гадоў пасля вайны стала вядома пра дзейнасць гэтай групы, а ў гонар 20-годдзя Перамогі мужная патрыётка была ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза.

**У. К. ЯКАВЕНКА. Партызанскі камбрыг:** Пра Героя Савецкага Саюза Д. Т. Гуляева. — М.: Палітвыдат, 1987.

Аўтар, удзельнік партызанскай барацьбы ў Беларусі, расказвае пра свайго баявога таварыша — таленавітага партызанскага камандзіра, ажыццявіўшага ў гады Вялікай Айчыннай вайны шмат паспяховых баявых аперацый у тыле ворага.

**Т. М. СУМАРОКАВА. Праляцелі нада мной пасля бою:** Пра двойчы Героя Савецкага Саюза Г. Ф. Сіўкова і Героя Савецкага Саюза В. Е. Рабаву. — М.: Палітвыдат, 1988.

Гэта кніга прысвечана двум вядомым лётчыкам. Яе аўтар — блізкі сябар сям'і герояў, былы штурман праслаўленага авіяцыйнага жаночага палка, які ў гады Вялікай Айчынай вайны прайшоў шлях да Берліна.

**У. Ф. МАКЕЕЎ. Камісар «Марта», герой Севастопаля:** Пра Героя Савецкага Саюза, віцэ-адмірала М. М. Кулакова. — М.: Палітвыдат, 1987.

Кніга пераносіць чытача ў вогненную Адэсу і гераічны Севастопаль, расказвае аб баях і подзвігах савецкіх людзей ля сцен Навparасійска і Керчы.

**Я. Р. САДОЎСКІ. Такая служба — перамагаць:** Пра Галоўнага Маршала бранятанкавых войск А. Х. Бабаджаняна. — М.: Палітвыдат, 1988.

Гэта кніга пра аднаго з праслаўленых военачальнікаў, чалавека, камуніста незвычайнай храбрасці, вялікай душэўнасці.

**Г. П. КУЛЯШОЎ. Незалежна ад звання:** Аб генерал-лейтэнанце Л. Г. Пятроўскім. — М.: Палітвыдат, 1987.

Аўтар кнігі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны шмат гадоў збіраў матэрыялы аб жыццёвым шляху генерал-лейтэнанта Л. Г. Пятроўскага, загінуўшага ў жніўні 1941 года. Аб тым, як фарміраваўся характар героя — сына вядомага бальшавіка Г. І. Пятроўскага, як выбраў ён прафесію кадравага ваеннага — абаронцы Краіны Саветаў, як стойка і мужна змагаўся з ворагам у цяжэйшыя першыя дні вайны, расказваецца ў біяграфічным нарысе, які адрасуецца масаваму чытачу.

**І. ЛАПІЦКАЯ,**
**прадавец кнігарні № 19.**

# З НОВЫМ ЗВАННЕМ!

**Дзяржаўны спартыўны камітэт СССР нядаўна прысвоіў групе беларускіх спартсменаў званне «Майстар спорту СССР». Яго ўдастоены і студэнт фізічнага факультэта Аляксандр Фрунчак. Ён выканаў запаветны нарматыў па парусному спорту.**

# СЕЗОН АДКРЫЛІ ФУТБАЛІСТЫ

**У красавіку адбыўся традыцыйны турнір па футболу на прыз адкрыцця сезона ў г. Бабруйску. У спаборніцтвах прыняла ўдзел і каманда нашага універсітэта. Пераможцамі сталі гаспадары — бабруйскія трактаразаводцы. Другое месца дасталося футбалістам магілёўскага «Тарпеда». Тройку прызёраў замкнулі футбалісты ГДУ.**

**З 7 па 14 мая на стадыёне ВА «Гомельдрэў» у Навабеліцы адбудуцца спаборніцтвы футбалістаў па праграме спартакіяды ВНУ рэспублікі. На поле выйдуць і футбалісты нашага універсітэта.**

**У. ДЖЫОЕЎ,**
**трэнер каманды ГДУ.**

# ЗНОЎ ПАДВЁЎ КАМАНДУ

У Мазыры прайшлі абласныя спаборніцтвы па летняму мнагабор'ю комплексу ГПА сярод навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў і студэнтаў ВНУ. На гэты раз каманда нашага універсітэта, якая стала ў мінулым годзе чэмпіёнам аналагічных спаборніцтваў, выступіла ніжэй сваіх магчымасцей. Яна заняла толькі чацвёртае месца.

Зноў даводзіцца гаварыць аб тым, што каманду ГДУ не ў першы раз падвёў студэнт 2-га курса факультэта фізвыхавання Ігар Кукобнікаў.

**Ю. ПРЫСЯЖНОЙ,**
**выкладчык кафедры фізвыхавання.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ02363
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 234.